Установа адукацыі

«БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ТЭХНАЛАГІЧНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ»

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Першы прарэктар БДТУ
____________ А.А. Саковіч
«_____»_________________2024 года
Рэгістрацыйны № УД ______ / вуч.

# БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА

**Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі**
**па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасці**

**6-05-0211-06 Выдавецкая справа**

2024

Вучэбная праграма складзена на аснове адукацыйнага стандарта вышэйшай адукацыі АСВА 6-05-0211-06-2023 (зацверджанага і ўведзенага ў дзеянне 04.08.2023, пастанова № 237) і вучэбных планаў рэгістрацыйныя №№ 05-021-001/уч. (зацв. 28.04.2023) і 05-021-002/уч. (зацв. 28.04.2023).

**СКЛАДАЛЬНІК:**

Мандзік В. А., старшы выкладчык кафедры беларускай філалогіі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт», кандыдат філалагічных навук.

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**

**Л. У. Іконнікава,** вучоны сакратар філіяла "Інстытут літаратуразнаўства імя Янкі Купалы" Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі, кандыдат філалагічных навук.

**У. І. Кулікові**ч, дацэнт кафедры рэдакцыйна-выдавецкіх тэхналогій УА «Беларускі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт», кандыдат філалагічных навук, дацэнт.

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**

кафедрай беларускай філалогіі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт» (пратакол № 4 ад 28.11.2023);

метадычнай камісіяй факультэта прынттэхналогій і медыякамунікацый ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт» (пратакол № 3 ад 30.11.2023);

навукова-метадычным саветам установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт» (пратакол № 3 ад 29.12.2023).

## 1. Тлумачальная запіска

### Месца вучэбнай дысцыпліны «Беларуская літаратура» ў сістэме падрыхтоўкі спецыяліста з вышэйшай адукацыяй

Вывучэнне курса беларускай літаратуры ў сістэме прафесійнай падрыхтоўкі будучых рэдактараў-тэхнолагаў абумоўлена як неабходнасцю фарміравання ў іх спецыяльных ведаў і ўменняў, так і агульнай тэндэнцыяй гуманізацыі працэсу навучання. Сярод гуманітарных дысцыплін «Беларуская літаратура» займае асаблівае месца: нацыянальнае пісьменства – гэта не толькі від мастацтва, але і адна з форм грамадзянскай свядомасці. Такім чынам, засваенне і асэнсаванне лепшых узораў багатай беларускай літаратурнай спадчыны спрыяе фарміраванню як эстэтычнага густу асобы, так і грамадскіх ідэалаў, маральных поглядаў і прынцыпаў. Літаратура здольна цэласна, сістэмна ўплываць на пачуцці студэнта, яго светабачанне, агульную культуру асобы, зарыентаванай на нацыянальныя і агульначалавечыя каштоўнасці.

Выкладанне дысцыпліны «Беларуская літаратура» забяспечвае сістэматызаванае і паглыбленае авалоданне ведамі па развіцці і ўдасканаленні нацыянальнага прыгожага пісьменства ад старажытнасці да сучаснасці, што фарміруе пачуццё нацыянальнай самасвядомасці на аснове павагі да літаратурна-мастацкай спадчыны як нацыянальнага скарбу. У студэнтаў фарміруецца ўяўленне пра беларускую літаратуру як ключавы кампанент нацыянальнай культуры, які ўласцівымі толькі яму сродкамі адлюстроўвае інтэлектуальны і духоўны вопыт народа. Акрамя таго, будучыя спецыялісты павінны разумець узаемаабумоўленасць і ўзаемазвязанасць беларускага літаратурнага працэсу з еўрапейскім і сусветным, а таксама адчуваць сваю прафесійную далучанасць да гісторыка-літаратурнага працэсу на сучасным этапе.

### Мэты і задачы вучэбнай дысцыпліны

**Мэтай** вывучэння курса «Беларуская літаратура» з'яўляецца засваенне студэнтамі заканамернасцей і асаблівасцей развіцця літаратурнага працэсу ад старажытнасці да сучаснасці, фарміраванне ўяўлення пра гісторыка-літаратурны працэс як пра цэласную з'яву, усведамленне пераемнасці і зменлівасці мастацкіх і светапоглядных сістэм, выпрацоўка ўменняў самастойнага аналізу мастацкіх твораў на аснове набытых ведаў па тэорыі літаратуры.

Змест дысцыпліны «Беларуская літаратура» прадугледжвае вырашэнне наступных **задач**:

– набыццё студэнтамі трывалых ведаў па творчасці асобных пісьменнікаў, мастацкай вартасці і ідэалагічнай канцэпцыі лепшых твораў нацыянальнага пісьменства, гісторыка-літаратурным працэсе, асновах тэорыі літаратуры;

– фарміраванне ўменняў і навыкаў працы з літаратуразнаўчым матэрыялам;

– асэнсаванне студэнтамі ролі мастацкай літаратуры ў працэсе культурнай ідэнтыфікацыі асобы;

– фарміраванне кантэкстуальнага бачання нацыянальнага пісьменства ў еўрапейскай і сусветнай культурнай прасторы;

– стымуляванне ўласнай творчай дзейнасці студэнтаў, кампетэнцый дыскурсійнага бачання найноўшага літаратурна-мастацкага жыцця.

– выхаванне сродкамі мастацкай літаратуры каштоўнасных арыентацый, нормаў і правіл фарміравання паводзін на аснове ідэй гуманізму, дабра і справядлівасці.

Засваенне студэнтамі дысцыпліны «Беларуская літаратура» забяспечвае фарміраванне такой базавай прафесійнай кампетэнцыі, як здольнасць прымяняць веды па гісторыі беларускай літаратуры для планавання кнігавыдавецкай дзейнасці (БПК-6).

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны студэнт павінен:

***ведаць:***

– класіфікацыю мастацкіх твораў з пункту гледжання літаратурных родаў, відаў і жанраў;

– перыядызацыю літаратуры;

– жыццёвыя і творчыя біяграфіі найбольш вядомых прадстаўнікоў нацыянальнай літаратуры;

– жанрава-стылістычныя асаблівасці вывучаемых твораў;

– асноўныя лексікаграфічныя крыніцы па спецыяльнасці;

– канцэпцыі духоўна-эстэтычных, грамадскіх каштоўнасцей і прыярытэтаў мінулых эпох і сучаснасці;

***умець:***

– характарызаваць канцэпцыю мастацкіх каштоўнасцей, маральных прыярытэтаў і эстэтычных ідэалаў кожнай літаратурнай эпохі;

– вызначаць жанрава-стылістычныя асаблівасці твора;

– аналізаваць твор з улікам аўтарскай пазіцыі, кантэкстуальнага, гістарычнага і ўласнага бачання літаратурнага працэсу;

– самастойна вызначаць мастацкія вартасці твора;

– прымяняць тэарэтычныя асновы курса для рашэння канкрэтных практычных задач у прафесійнай дзейнасці;

***валодаць:***

– методыкай аналізу твора з улікам яго ідэйна-мастацкай цэласнасці, канцэптуальнай пазіцыі аўтара, кантэкстаў;

– навыкамі комплекснай характарыстыкі гісторыка-літаратурнага працэсу кожнай эпохі ў яго сувязі з дынамікай мастацкіх пошукаў і грамадска-культурных прыярытэтаў.

**Сувязі з іншымі вучэбнымі дысцыплінамі.** Веды, набытыя пры вывучэнні курса беларускай літаратуры, дазваляюць лепш зразумець і асэнсаваць змест дысцыпліны «Сусветная літаратура». Акрамя таго, яны неабходныя для паспяховага засваення спецыяльных дысцыплін па рэдагаванні літаратуры розных відаў і жанраў (“Агульны курс рэдагавання”, “Рэдактарская падрыхтоўка літаратурна-мастацкіх выданняў”, “Рэдактарская падрыхтоўка навукова-тэхнічных і вучэбных выданняў” “Рэдактарская падрыхтоўка выданняў для дзяцей”, “Рэдактарская падрыхтоўка СМІ”, “Рэдагаванне даведачнай літаратуры”, “Рэдагаванне перакладной літаратуры”).

## План вучэбнай дысцыпліны для дзённай формы атрымання вышэйшай адукацыі

| Курс | Семестр | Усяго вучэбных гадзін | Колькасць залікових адзінак | Аўдыторных гадзін (у адпаведнасці з вучэбным планам УВА) | | | Форма прамежкавай атэстацыі |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | Усяго | Лекцыі | Практычныя заняткі | |
| I | II | 108 | 3 | 54 | 36 | 18 | залік |

## План вучэбнай дысцыпліны для завочнай формы атрымання вышэйшай адукацыі

<table>
<tr><th rowspan="2">Курс</th><th rowspan="2">Семестр</th><th rowspan="2">Усяго вучэбных гадзін</th><th rowspan="2">Колькасць залікових адзінак</th><th colspan="3">Аўдыторных гадзін (у адпаведнасці з вучэбным планам УВА)</th><th rowspan="2">Форма прамежкавай атэстацыі</th></tr>
<tr><th>Усяго</th><th>Лекцыі</th><th>Практычныя заняткі</th></tr>
<tr><td>II</td><td>IV</td><td rowspan="2">108</td><td></td><td rowspan="2">12</td><td>2</td><td></td><td rowspan="2">залік</td></tr>
<tr><td>III</td><td>V</td><td>3</td><td>6</td><td>4</td></tr>
</table>

## 2. ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

### 1. Уводзіны ў курс «Беларуская літаратура»

Мастацкая літаратура як асноўны фактар нацыянальнай ідэнтычнасці беларускага народа.

Ідэйна-мастацкія асновы фарміравання беларускай літаратуры: фальклорныя, светапоглядныя (рэлігійныя), грамадзянска-патрыятычныя.

Умовы і этапы развіцця беларускай літаратуры, літаратуразнаўчай думкі.

Асноўныя навуковыя цэнтры вывучэння беларускай літаратуры. Вядомыя беларускія літаратуразнаўцы, іх навуковая спадчына.

Асноўныя беларускія выдавецтвы і літаратурна-мастацкія выданні.

### 2. Старажытная літаратура

Літаратура на старабеларускіх землях у эпоху Кіеўскай Русі (X – першая палова XIII ст.). Пераемнасць візантыйскай культурнай спадчыны і фарміраванне мясцовых хрысціянскіх традыцый.

Перакладная літаратура і яе жанры (апокрыфы, павучанні, казанні, агіяграфіі).

Зараджэнне нацыянальнай адметнасці старажытнабеларускай літаратуры. Сінтэз паганскага і хрысціянскага светапогляду.

Культурныя дзеячы і пісьменнікі сярэднявечнай Беларусі: Кірыла Тураўскі, Ефрасіння Полацкая, Клімент Смаляціч.

«Жыціе Ефрасінні Полацкай» як арыгінальны помнік агіяграфічнай (жыційнай) літаратуры. Сцвярджэнне ў творы ідэалаў хрысціянскага гуманізму. Вобраз асветніцы і падзвіжніцы ў жыціі.

«Слова пра паход Ігара» як выдатны помнік гераічнага эпасу ўсходніх славян. Праблема аўтарства твора, яго ідэйны змест і кампазіцыя. Беларускія рэаліі ў «Слове» і яго пераклады на сучасную беларускую мову.

### 3. Старабеларуская літаратура.
### Адраджэнне (другая палова XIII – першая палова XVI ст.)

Беларускія летапісы як помнікі гісторыі і культуры, станаўлення дзяржаўнай свядомасці беларускага народа. Класіфікацыя і кампазіцыя твораў («Аповесць мінулых гадоў», Кіеўскі і Галіцка-Валынскі летапісы, «Летапісец вялікіх князёў літоўскіх», «Беларуска-літоўскі летапіс 1446 года»). Мастацкія асаблівасці беларуска-літоўскіх летапісаў.

Біблія як фундаментальны помнік сусветнай літаратуры і культуры. Асноўныя этапы жыцця і дзейнасці Ф. Скарыны, важнейшыя рысы рэнесанснага гуманізму ў яго творчасці (прадмовы да кніг Бібліі «Руф», «Эсфір», «Юдзіф»). Наватарства і гістарычнае значэнне кнігавыдавецкай працы.

Эстэтычныя ідэалы ў мастацкай творчасці і асветніцкая праграма першадрукара. Вобраз Ф. Скарыны ў беларускай літаратуры.

Нацыянальная адаптацыя еўрапейскіх рэнесансных традыцый. Рэфармацыя. Полікультурнасць. Зараджэнне і развіццё паэзіі.

Рэлігійна-маральная, царкоўна-дыдактычная, вучэбная і перакладная літаратура.

Лацінамоўная літаратура (М. Гусоўскі і Я. Вісліцкі). Тэматыка і наватарства паэмы «Песня пра зубра».

Хрысціянскі дыскурс творчасці і выдавецкай дзейнасці С. Буднага (прадмова да «Катэхізіса» 1562 г.) і В. Цяпінскага (прадмова да «Евангелля» 1570 г.).

### 4. Літаратура эпохі Барока (канец XVI – 30-я гады XVIII ст.)

Барока як мастацкая сістэма. Асаблівасці беларускага Барока.

Творчасць Сімяона Полацкага.

Контррэфармацыя. Праваслаўныя царкоўныя брацтвы. Царкоўна-палемічная публіцыстыка (Пётр Скарга, Іпацій Пацей). Творчасць М. Сматрыцкага («Трэнас») і А. Філіповіча («Дыярыуш»).

Гісторыка-мемуарная літаратура («Баркулабаўскі летапіс», «Дыярыушы» Казіміра Маскевіча, Фёдара Еўлашоўскага).

Парадыйна-сатырычныя творы: «Прамова Мялешкі» і «Ліст да Абуховіча». Рысы барочнай эстэтыкі ў творах.

Драматургія Барока. Інтэрмедыі «Селянін, Літарат, Самахвальскі», «Селянін у касцёле».

### 5. Літаратура эпохі Асветніцтва (1740-я гады – канец XVIII ст.)

Асветніцтва і яго бачанне сродкаў удасканалення грамадства і чалавека.

Класіцызм і сентыменталізм як асноўныя літаратурныя кірункі эпохі Асветніцтва: еўрапейскія традыцыі і беларускі вопыт.

Паэзія: бурлескна-сатырычныя і героіка-патрыятычныя творы.

Аўтабіяграфічная проза. «Авантуры майго жыцця» Саламеі Пільштыновай-Русецкай.

Драматургія. Прыдворныя тэатры і іх рэпертуар. Творчасць Францішкі Уршулі Радзівіл. Школьны тэатр. Батлейка. Творчасць К. Марашэўскага і М. Цяцерскага. «Камедыя» К. Марашэўскага – арыгінальны драматычны твор беларускага Асветніцтва.

### 6. Беларуская літаратура XIX ст.

Гістарычныя ўмовы ўзнікнення і развіцця новай беларускай літаратуры.

Сентыменталізм, рамантызм, рэалізм: еўрапескія традыцыі і дамінантныя рысы ў беларускай літаратуры.

Віленскі ўніверсітэт, дзейнасць філаматаў і філарэтаў (Тадэвуш Лада-Заблоцкі, Франц Савіч).

Беларуска-польскае культурнае памежжа і яго адлюстраванне ў мастацкай літаратуры. А. Міцкевіч і Беларусь. Творчасць Я. Чачота і Я. Баршчэўскага.

Травесційныя паэмы «Энеіда навыварат» і «Тарас на Парнасе»: праблема аўтарства, мастацка-вобразная сістэма твораў.

Творчасць В. Дуніна-Марцінкевіча: асноўныя жанры, ідэйны змест твораў, іх стылёвыя адметнасці.

Месца і роля Ф. Багушэвіча ў беларускай літаратуры. Тэма свабоды ў вершаваным апавяданні «Кепска будзе».

Літаратурная кагорта пісьменнікаў-дэмакратаў: А. Абуховіч, А. Гурыновіч. Даследаванне псіхалогіі простага чалавека ў паэме Янкі Лучыны «Паляўнічыя акварэлькі з Палесся». Тэма экалогіі ў творы.

## 7. Літаратура першай паловы XX ст.

Грамадскія ўмовы і агульная характарыстыка беларускай літаратуры пачатку XX стагоддзя. Нашаніўскі перыяд. Станаўленне беларускай паэзіі, прозы, драматургіі, літаратурнай крытыкі і публіцыстыкі.

Літаратурныя партрэты вядомых нашаніўцаў: Цёткі, Ядвігіна Ш., Змітрака Бядулі, А. Гаруна, М. Гарэцкага і інш.

Адлюстраванне нацыянальнай ідэі ў паэтычнай і драматургічнай творчасці Янкі Купалы.

Паэзія і проза Якуба Коласа як этапы зацвярджэння класічнасці новай беларускай літаратуры.

Традыцыі і наватарства, жанрава-стылістычныя асаблівасці творчасці Максіма Багдановіча.

Беларуская літаратура перыяду нацыянальнага будаўніцтва (1920–1930 гг.). Літаратурныя аб’яднанні «Маладняк», «Узвышша», БелАПП і інш. Развіццё паэзіі, прозы, крытыкі і літаратуразнаўства.

Станаўленне і развіццё беларускага рамана і аповесці: Пафас і тэматычны абсяг. Жанрава-стылістычныя асаблівасці.

Раман А. Мрыя «Запіскі Самсона Самасуя» ў кантэксце беларускай і еўрапейскай сатырычнай прозы. Параўнальная характарыстыка Самсона Самасуя з героямі Я. Гашака, М. Булгакава, К. Крапівы.

Сацыяльныя і псіхалагічныя праблемы калектывізацыі ў творчасці М. Зарэцкага. Асноўная праблема рамана М. Зарэцкага «Вязьмо». Адносіны аўтара да калектывізацыі. Роля вобраза Галілея ў прадбачанні аўтарам будучыні. Праблема гуманізму. «Пацяробаўшчына» як агульная з’ява калектывізацыі. Паняцце тэмы і праблемы літаратурнага твора.

Сацыялістычны рэалізм: станаўленне канону і сучасная дэкананізацыя.

Літаратура перыяду Вялікай Айчыннай вайны і першых пасляваенных дзесяцігоддзяў. Архетыпы і сімволіка ў раманах К.Чорнага «Пошукі будучыні» і «Млечны шлях».

Пераасэнсаванне ваеннай тэматыкі пісьменнікамі другой паловы XX стагоддзя. Тэма пасляваеннага аднаўлення. Патрыятычны пафас літаратуры. Спрошчанасць канфліктаў і сітуацый. Тэма вяртання ў родны дом былых франтавікоў.

## 8. Літаратура другой паловы XX ст.

Паэзія: агульныя тэндэнцыі і творчыя індывідуальнасці, жанрава-тэматычны дыяпазон (А. Куляшоў, М. Танк, П. Панчанка, Н. Гілевіч, Р. Барадулін). Традыцыі і наватарства, творчыя эксперыменты. Творчыя

засваенні сусветнага вопыту і ўласныя набыткі ў галіне паэтычных жанраў: санеты, актавы, рубаі, танка, хоку, вершаказы, пункціры. Інтэлектуалізацыя мастацкага мыслення. Філасофская і рэлігійна-хрысціянаская заглыбленасць

Проза: жанрава-стылістычная і тэматычная разнастайнасць беларускага рамана, малыя празаічныя жанры (В. Быкаў, У. Караткевіч, Я. Сіпакоў, В. Карамазаў). Паказ сацыяльных і маральных канфліктаў, выклікаў часу; асэнсаванне гістарычнага мінулага. Псіхалагічная завостранасць і філасофская паглыбленасць твораў. Узбагачэнне новымі тэмамі. Развіццё гістарычнай тэматыкі. Паняцце экзістэнцыялізму. Экзістэнцыялізм у беларускай літаратуры. Паказ сацыяльных і маральных канфліктаў праз пастаноўку пытанняў экалогіі ў эпічных творах.

Драматургія: традыцыі і наватарства, зместавая сутнасць канфліктаў часу (асабістых і грамадскіх). Шляхі абнаўлення традыцыйнай паэтыкі: псіхалагізм, сімвалізм, парадаксальнасць, эксперымент, ірацыянальны пачатак, постмадэрнісцкая гульня. Творчасць А. Макаёнка («Трыбунал», «Зацюканы апостал»), К. Крапівы («Хто смяецца апошнім»). Гістарычная тэма і яе ўвасабленне ў творчасці А. Дударава («Князь Вітаўт», «Палачанка»). Драматургічныя творы А. Петрашкевіча («Напісанае застаецца»).

Пісьменніцкі вопыт маладзейшай генерацыі: У. Бутрамеева і інш. Беларускія тэатры і іх рэпертуар сёння.

## 9. Сучасны літаратурны працэс

Сучасны стан літаратурнага працэсу.

Развіццё паэзіі (Л. Дранько-Майсюк, Алесь Бадак і інш.), прозы (А. Федарэнка, Л. Рублеўская і інш.), драматургіі (У. Сауліч, І. Сідарук, Ю. Станкевіч, С. Кавалёў, А. Курэйчык і інш.), літаратурнай крытыкі.

Грамадска-сацыяльныя абставіны. Рэалістычныя і мадэрнісцкія тэндэнцыі. Рускія і замежныя кантакты. Рознастылёвасць прозы і паэзіі. Змястоўны і фармальны эксперымент. Дасягненні крытыкі.

## 3. ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ДЛЯ ДЗЁННАЙ ФОРМЫ АТРЫМАННЯ ВЫШЭЙШАЙ АДУКАЦЫІ

| № раздзела, тэмы | НАЗВА РАЗДЗЕЛА, ТЭМЫ | Колькасць аўдыторных гадзін | | Колькасць гадзін самастойнай працы | Форма кантролю |
|---|---|---|---|---|---|
| | | лекцыі | практычныя заняткі | | |
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| **1.** | **УВОДЗІНЫ Ў КУРС «БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА»** | **1** | | **3** | Залік |
| | 1. Мастацкая літаратура як асноўны фактар нацыянальнай ідэнтычнасці беларускага народа.<br>2. Беларуская літаратура як прадмет навуковага вывучэння і як вучэбная дысцыпліна.<br>3. Род, від, жанр літаратуры.<br>4. Агульныя тыпы перыядызацыі беларускай літаратуры. З гісторыі вывучэння беларускай літаратуры.<br>5. Ідэйна-мастацкія асновы фарміравання беларускай літаратуры: фальклорныя, светапоглядныя (рэлігійныя), грамадзянска-патрыятычныя.<br>6. Асноўныя навуковыя цэнтры вывучэння беларускай літаратуры. Вядомыя беларускія літаратуразнаўцы, іх навуковая спадчына.<br>7. Асноўныя беларускія выдавецтвы і літаратурна-мастацкія выданні. | 1 | | 1<br>1<br>1 | Франтальнае апытанне па кантрольных пытаннях |
| **2.** | **СТАРАЖЫТНАЯ ЛІТАРАТУРА** | **2** | **2** | **4** | Залік |
| | 1. Літаратура на старабеларускіх землях у эпоху Кіеўскай Русі (Х – першая палова ХІІІ ст.). Пераемнасць візантыйскай культурнай спадчыны і фарміраванне мясцовых хрысціянскіх традыцый.<br>2. Перакладная літаратура і яе жанры (апокрыфы, павучанні, казанні, агіяграфіі).<br>3. Зараджэнне нацыянальнай адметнасці старажытнабеларускай літаратуры. Сінтэз паганскага і хрысціянскага светапоглядаў.<br>4. Культурныя дзеячы і пісьменнікі сярэднявечнай Беларусі: Кірыла Тураўскі, Ефрасіння Полацкая, Клімент Смаляціч. | 2 | | 2 | Тэст |

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| | 5. «Жыціе Ефрасінні Полацкай» як арыгінальны помнік агіяграфічнай (жыційнай) літаратуры. Сцвярджэнне ў творы ідэалаў хрысціянскага гуманізму. Вобраз асветніцы і падзвіжніцы ў жыцыі.<br>6. «Слова пра паход Ігара» як выдатны помнік гераічнага эпасу ўсходніх славян. Праблема аўтарства твора, яго ідэйны змест і кампазіцыя. Беларускія рэаліі ў «Слове» і яго пераклады на сучасную беларускую мову. | | 2 | <br><br><br>2 | |
| **3.** | **СТАРАБЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА.<br>АДРАДЖЭННЕ (ДРУГАЯ ПАЛОВА XIII – ПЕРШАЯ ПАЛОВА XVI СТ.)** | **4** | **2** | **7** | Залік |
| | 1. Беларускія летапісы як помнікі гісторыі і культуры, станаўлення дзяржаўнай свядомасці беларускага народа. Класіфікацыя і кампазіцыя твораў («Аповесць мінулых гадоў», Кіеўскі і Галіцка-Валынскі летапісы, «Летапісец вялікіх князёў літоўскіх», «Беларуска-літоўскі летапіс 1446 года»). Мастацкія асаблівасці беларуска-літоўскіх летапісаў.<br>2. Біблія як фундаментальны помнік сусветнай літаратуры і культуры. Асноўныя этапы жыцця і дзейнасці Ф. Скарыны, важнейшыя рысы рэнесанснага гуманізму ў яго творчасці (прадмовы да кніг Бібліі «Руф», «Эсфір», «Юдзіф»). Наватарства і гістарычнае значэнне кнігавыдавецкай працы.<br>3. Эстэтычныя ідэалы ў мастацкай творчасці і асветніцкая праграма першадрукара. Вобраз Ф. Скарыны ў беларускай літаратуры.<br>4. Нацыянальная адаптацыя еўрапейскіх рэнесансных традыцый. Рэфармацыя. Полікультурнасць. Зараджэнне і развіццё паэзіі.<br>5. Рэлігійна-маральная, царкоўна-дыдактычная, вучэбная і перакладная літаратура.<br>6. Лацінамоўная літаратура (М. Гусоўскі і Я. Вісліцкі). Тэматыка і наватарства паэмы «Песня пра зубра».<br>7. Хрысціянскі дыскурс творчасці і выдавецкай дзейнасці С. Буднага (прадмова да «Катэхізіса» 1562 г.) і В. Цяпінскага (прадмова да «Евангелля» 1570 г.). | 2<br><br><br><br><br><br><br><br><br><br><br><br><br><br><br>2 | <br><br><br><br><br>1<br><br><br><br><br><br><br><br><br><br><br><br>1 | 2<br><br><br><br><br><br><br><br><br>2<br><br>1<br><br>2 | Тэст<br><br><br><br><br><br><br><br><br>Фран-тальнае апытанне па кантроль-ных пытаннях |
| **4.** | **ЛІТАРАТУРА ЭПОХІ БАРОКА (КАНЕЦ XVI – 30-Я ГАДЫ XVIII СТ.)** | **2** | **2** | **5** | Залік |
| | 1. Барока як мастацкая сістэма. Асаблівасці беларускага Барока.<br>2. Творчасць Сімяона Полацкага.<br>3. Контррэфармацыя. Праваслаўныя царкоўныя брацтвы. Царкоўна-палемічная публіцыстыка (Пётр Скарга, Іпацій Пацей). Творчасць М. Сматрыцкага («Трэнас») і А. Філіповіча («Дыярыуш»).<br>4. Гісторыка-мемуарная літаратура («Баркулабаўскі летапіс», «Дыярыушы» Казіміра Маскевіча, Фёдара Еўлашоўскага). | 2 | <br><br>1 | <br>1<br><br><br><br>2 | Тэст |

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| | 5. Парадыйна-сатырычныя творы: «Прамова Мялешкі» і «Ліст да Абуховіча». Рысы барочнай эстэтыкі ў творах.<br>6. Драматургія Барока. Інтэрмеды «Селянін, Літарат, Самахвальскі», «Селянін у касцёле». | | 1 | 2 | |
| **5.** | **ЛІТАРАТУРА ЭПОХІ АСВЕТНІЦТВА (1740-Я ГГ. – КАНЕЦ XVIII СТ.)** | **2** | **2** | **5** | Залік |
| | 1. Асветніцтва і яго бачанне сродкаў удасканалення грамадства і чалавека.<br>2. Класіцызм і сентыменталізм як асноўныя літаратурныя кірункі эпохі Асветніцтва: еўрапейскія традыцыі і беларускі вопыт.<br>3. Паэзія: бурлескна-сатырычныя і героіка-патрыятычныя творы.<br>4. Аўтабіяграфічная проза. «Авантуры майго жыцця» Саламеі Пільштыновай-Русецкай.<br>5. Драматургія. Прыдворныя тэатры і іх рэпертуар. Творчасць Францішкі Уршулі Радзівіл.<br>6. Школьны тэатр. Батлейка. Творчасць К. Марашэўскага і М. Цяцерскага. «Камедыя» К. Марашэўскага – арыгінальны драматычны твор беларускага Асветніцтва. | 2 | 1<br>1 | 1<br>2<br>2 | Тэст |
| **6.** | **БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА XIX СТ.** | **6** | **3** | **10** | Залік |
| | 1. Гістарычныя ўмовы ўзнікнення і развіцця новай беларускай літаратуры.<br>2. Сентыменталізм, рамантызм, рэалізм: еўрапескія традыцыі і дамінантныя рысы ў беларускай літаратуры.<br>3. Віленскі ўніверсітэт, дзейнасць філаматаў і філарэтаў (Тадэвуш Лада-Заблоцкі, Франц Савіч).<br>4. Беларуска-польскае культурнае памежжа і яго адлюстраванне ў мастацкай літаратуры. А. Міцкевіч і Беларусь. Творчасць Я. Чачота і Я. Баршчэўскага.<br>5. Травесційныя паэмы «Энеіда навыварат» і «Тарас на Парнасе»: праблема аўтарства, мастацка-вобразная сістэма твораў.<br>6. Творчасць В. Дуніна-Марцінкевіча: асноўныя жанры, ідэйны змест твораў, іх стылёвыя адметнасці.<br>7. Месца і роля Ф. Багушэвіча ў беларускай літаратуры. Тэма свабоды ў вершаваным апавяданні «Кепска будзе».<br>8. Літаратурная кагорта пісьменнікаў-дэмакратаў: А. Абуховіч, А. Гурыновіч.<br>9. Даследаванне псіхалогіі простага чалавека ў паэме Янкі Лучыны «Паляўнічыя акварэлькі з Палесся». Тэма экалогіі ў творы. | 2<br>2<br>2 | 1<br>1<br>1 | 2<br>2<br>2<br>2<br>2 | Тэст |
| **7.** | **ЛІТАРАТУРА ПЕРШАЙ ПАЛОВЫ XX СТ.** | **10** | **3** | **10** | Залік |
| | 1. Грамадскія ўмовы і агульная характарыстыка беларускай літаратуры пачатку XX стагоддзя. Нашаніўскі перыяд. Станаўленне беларускай паэзіі, прозы, драматургіі, літаратурнай крытыкі і публіцыстыкі. | 2 | | | Праверачная работа |

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| | 2. Літаратурныя партрэты вядомых нашаніўцаў: Цёткі, Ядвігіна Ш., Змітрака Бядулі, А. Гаруна, М. Гарэцкага і інш.<br>3. Адлюстраванне нацыянальнай ідэі ў паэтычнай і драматургічнай творчасці Янкі Купалы.<br>4. Паэзія і проза Якуба Коласа як этапы зацвярджэння класічнасці новай беларускай літаратуры.<br>5. Традыцыі і наватарства, жанрава-стылістычныя асаблівасці творчасці Максіма Багдановіча.<br>6. Беларуская літаратура перыяду нацыянальнага будаўніцтва (1920–1930 гг.). Літаратурныя аб'яднанні «Маладняк», «Узвышша», БелАПП і інш. Развіццё паэзіі, прозы, крытыкі і літаратуразнаўства.<br>7. Станаўленне і развіццё беларускага рамана і аповесці: Пафас і тэматычны абсяг. Жанрава-стылістычныя асаблівасці.<br>8. Раман А. Мрыя «Запіскі Самсона Самасуя» ў кантэксце беларускай і еўрапейскай сатырычнай прозы. Параўнальная характарыстыка Самсона Самасуя з героямі Я. Гашака, М. Булгакава, К. Крапівы.<br>9. Сацыяльныя і псіхалагічныя праблемы калектывізацыі ў творчасці М. Зарэцкага. Асноўная праблема рамана М. Зарэцкага «Вязьмо». Адносіны аўтара да калектывізацыі. Роля вобраза Галілея ў прадбачанні аўтарам будучыні. Праблема гуманізму. «Пацяробаўшчына» як агульная з'ява калектывізацыі. Паняцце тэмы і праблемы літаратурнага твора.<br>10. Сацыялістычны рэалізм: станаўленне канону і сучасная дэкананізацыя.<br>11. Літаратура перыяду Вялікай Айчыннай вайны і першых пасляваенных дзесяцігоддзяў.<br>12. Архетыпы і сімволіка ў раманах К.Чорнага «Пошукі будучыні» і «Млечны шлях». Аўтарскі аналіз сістэмы духоўных каштоўнасцей беларусаў. | <br><br>2<br><br>2<br><br>2<br><br>2 | <br>1<br><br>1<br><br>1 | 2<br>2<br><br>2<br><br>2<br>2 | <br>Тэст |
| **8.** | **ЛІТАРАТУРА ДРУГОЙ ПАЛОВЫ XX СТ.** | **7** | **2** | **8** | Залік |
| | 1. Паэзія: агульныя тэндэнцыі і творчыя індывідуальнасці, жанрава-тэматычны дыяпазон (А. Куляшоў, М. Танк, П. Панчанка, Н. Гілевіч, Р. Барадулін). Традыцыі і наватарства, творчыя эксперыменты. Творчыя засваенні сусветнага вопыту і ўласныя набыткі ў галіне паэтычных жанраў: санеты, актавы, рубаі, хоку, вершаказы, пункціры. Інтэлектуалізацыя мастацкага мыслення. Філасофская і рэлігійна-хрысціянаская заглыбленасць<br>2. Проза: жанрава-стылістычная і тэматычная разнастайнасць беларускага рамана, малыя празаічныя жанры (В. Быкаў, У. Караткевіч, Я. Сіпакоў, В. Карамазаў). Паказ | 2<br><br>2 | <br><br>1 | 3<br><br>3 | Праве-рачная работа<br><br>Тэст |

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| | сацыяльных і маральных канфліктаў, выклікаў часу; асэнсаванне гістарычнага мінулага. Псіхалагічная завостранасць і філасофская паглыбленасць твораў. Узбагачэнне новымі тэмамі. Развіццё гістарычнай тэматыкі. Паняцце экзістэнцыялізму. Экзістэнцыялізм у беларускай літаратуры. Паказ сацыяльных і маральных канфліктаў праз пастаноўку пытанняў экалогіі ў эпічных творах.<br>3. Драматургія: традыцыі і наватарства, зместавая сутнасць канфліктаў часу (асабістых і грамадскіх). Шляхі абнаўлення традыцыйнай паэтыкі: псіхалагізм, сімвалізм, парадаксальнасць, эксперымент, ірацыянальны пачатак постмадэрнісцкая гульня. Творчасць А. Макаёнка («Трыбунал», «Зацюканы апостал»), К. Крапівы («Хто смяецца апошнім»). Гістарычная тэма і яе ўвасабленне ў творчасці А. Дударава («Князь Вітаўт», «Палачанка»). Драматургічныя творы А. Петрашкевіча («Напісанае застаецца»). | 3 | 1 | 2 | |
| **9.** | **СУЧАСНЫ ЛІТАРАТУРНЫ ПРАЦЭС** | **2** | **2** | **2** | Залік |
| | 1. Сучасны стан літаратурнага працэсу.<br>2 Развіццё паэзіі (Л. Дранько-Майсюк, Алесь Бадак і інш.), прозы (А. Федарэнка, Л. Рублеўская, В. Марціновіч і інш.), драматургіі (У. Сауліч, І. Сідарук, Ю. Станкевіч, С. Кавалёў, А. Курэйчык і інш.), літаратурнай крытыкі.<br>3. Беларускія тэатры і іх рэпертуар сёння.<br>4. Грамадска-сацыяльныя абставіны. Рэалістычныя і мадэрнісцкія тэндэнцыі. Рускія і замежныя кантакты. Рознастылёвасць прозы і паэзіі. Змястоўны і фармальны эксперымент. Дасягненні крытыкі. | 2 | 1<br><br>1 | 1<br><br>1 | Праве-рачная работа<br><br>Тэст |
| | **УСЯГО** | **36** | **18** | **54** | |

## ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ДЛЯ ЗАВОЧНАЙ ФОРМЫ АТРЫМАННЯ ВЫШЭЙШАЙ АДУКАЦЫІ

| № раз-дзела, тэмы | НАЗВА РАЗДЗЕЛА, ТЭМЫ | Колькасць аўдыторных гадзін | | Форма кантролю |
|---|---|---|---|---|
| | | лекцыі | практычныя заняткі | |
| 1 | 2 | 3 | 4 | 6 |
| | IV семестр | | | |
| **1.** | **УВОДЗІНЫ Ў КУРС «БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА»** | **1** | | Залік |
| | 1. Мастацкая літаратура як асноўны фактар нацыянальнай ідэнтычнасці беларускага народа.<br>2. Беларуская літаратура як прадмет навуковага вывучэння і як вучэбная дысцыпліна.<br>3. Род, від, жанр літаратуры.<br>4. Агульныя тыпы перыядызацыі беларускай літаратуры. З гісторыі вывучэння беларускай літаратуры.<br>5. Ідэйна-мастацкія асновы фарміравання беларускай літаратуры: фальклорныя, светапоглядныя (рэлігійныя), грамадзянска-патрыятычныя.<br>6. Асноўныя навуковыя цэнтры вывучэння беларускай літаратуры. Вядомыя беларускія літаратуразнаўцы, іх навуковая спадчына.<br>7. Асноўныя беларускія выдавецтвы і літаратурна-мастацкія выданні. | 1 | | |
| **2.** | **СТАРАЖЫТНАЯ ЛІТАРАТУРА** | **1** | | Залік |
| | 1. Літаратура на старабеларускіх землях у эпоху Кіеўскай Русі (X – першая палова XIII ст.). Пераемнасць візантыйскай культурнай спадчыны і фарміраванне мясцовых хрысціянскіх традыцый.<br>2. Перакладная літаратура і яе жанры (апокрыфы, павучанні, казанні, агіяграфіі).<br>3. Зараджэнне нацыянальнай адметнасці старажытнабеларускай літаратуры. Сінтэз паганскага і хрысціянскага светапогляду.<br>4. Культурныя дзеячы і пісьменнікі сярэднявечнай Беларусі: Кірыла Тураўскі, Ефрасіння Полацкая, Клімент Смаляціч. | 1 | | Тэст |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| | 5. «Жыціе Ефрасінні Полацкай» як арыгінальны помнік агіяграфічнай (жыційнай) літаратуры. Сцвярджэнне ў творы ідэалаў хрысціянскага гуманізму. Вобраз асветніцы і падзвіжніцы ў жыціі.<br>6. «Слова пра паход Ігара» як выдатны помнік гераічнага эпасу ўсходніх славян. Праблема аўтарства твора, яго ідэйны змест і кампазіцыя. Беларускія рэаліі ў «Слове» і яго пераклады на сучасную беларускую мову. | | | |
| | V семестр | | | |
| **3.** | **СТАРАБЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА.<br>АДРАДЖЭННЕ (ДРУГАЯ ПАЛОВА ХІІІ – ПЕРШАЯ ПАЛОВА XVI СТ.)** | **1** | **1** | Залік |
| | 1. Беларускія летапісы як помнікі гісторыі і культуры, станаўлення дзяржаўнай свядомасці беларускага народа. Класіфікацыя і кампазіцыя твораў («Аповесць мінулых гадоў», Кіеўскі і Галіцка-Валынскі летапісы, «Летапісец вялікіх князёў літоўскіх», «Беларуска-літоўскі летапіс 1446 года»). Мастацкія асаблівасці беларуска-літоўскіх летапісаў.<br>2. Біблія як фундаментальны помнік сусветнай літаратуры і культуры. Асноўныя этапы жыцця і дзейнасці Ф. Скарыны, важнейшыя рысы рэнесанснага гуманізму ў яго творчасці (прадмовы да кніг Бібліі «Руф», «Эсфір», «Юдзіф»). Наватарства і гістарычнае значэнне кнігавыдавецкай працы.<br>3. Эстэтычныя ідэалы ў мастацкай творчасці і асветніцкая праграма першадрукара. Вобраз Ф. Скарыны ў беларускай літаратуры.<br>4. Нацыянальная адаптацыя еўрапейскіх рэнесансных традыцый. Рэфармацыя. Полікультурнасць. Зараджэнне і развіццё паэзіі.<br>5. Рэлігійна-маральная, царкоўна-дыдактычная, вучэбная і перакладная літаратура.<br>6. Лацінамоўная літаратура (М. Гусоўскі і Я. Вісліцкі). Тэматыка і наватарства паэмы «Песня пра зубра».<br>7. Хрысціянскі дыскурс творчасці і выдавецкай дзейнасці С. Буднага (прадмова да «Катэхізіса» 1562 г.) і В. Цяпінскага (прадмова да «Евангелля» 1570 г.). | 1 | 1 | Тэст |
| **4.** | **ЛІТАРАТУРА ЭПОХІ БАРОКА (КАНЕЦ XVI – 30-Я ГАДЫ XVIII СТ.)** | **1** | | Залік |
| | 1. Барока як мастацкая сістэма. Асаблівасці беларускага Барока.<br>2. Творчасць Сімяона Полацкага.<br>3. Контррэфармацыя. Праваслаўныя царкоўныя брацтвы. Царкоўна-палемічная публіцыстыка (Пётр Скарга, Іпацій Пацей). Творчасць М. Сматрыцкага («Трэнас») і А. Філіповіча («Дыярыуш»).<br>4. Гісторыка-мемуарная літаратура («Баркулабаўскі летапіс», «Дыярыушы» Казіміра Маскевіча, Фёдара Еўлашоўскага). | 1 | | Тэст |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| | 5. Парадыйна-сатырычныя творы: «Прамова Мялешкі» і «Ліст да Абуховіча». Рысы барочнай эстэтыкі ў творах.<br>6. Драматургія Барока. Інтэрмедыі «Селянін, Літарат, Самахвальскі», «Селянін у касцёле». | | | |
| **5.** | **ЛІТАРАТУРА ЭПОХІ АСВЕТНІЦТВА (1740-Я ГГ. – КАНЕЦ XVIII СТ.)** | **1** | | Залік |
| | 1. Асветніцтва і яго бачанне сродкаў удасканалення грамадства і чалавека.<br>2. Класіцызм і сентыменталізм як асноўныя літаратурныя кірункі эпохі Асветніцтва: еўрапейскія традыцыі і беларускі вопыт.<br>3. Паэзія: бурлескна-сатырычныя і героіка-патрыятычныя творы.<br>4. Аўтабіяграфічная проза. «Авантуры майго жыцця» Саламеі Пільштыновай-Русецкай.<br>5. Драматургія. Прыдворныя тэатры і іх рэпертуар. Творчасць Францішкі Уршулі Радзівіл.<br>6. Школьны тэатр. Батлейка. Творчасць К. Марашэўскага і М. Цяцерскага. «Камедыя» К. Марашэўскага – арыгінальны драматычны твор беларускага Асветніцтва. | 1 | | |
| **6.** | **БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА ХІХ СТ.** | **1** | **1** | Залік |
| | 1. Гістарычныя ўмовы ўзнікнення і развіцця новай беларускай літаратуры.<br>2. Сентыменталізм, рамантызм, рэалізм: еўрапескія традыцыі і дамінантныя рысы ў беларускай літаратуры.<br>3. Віленскі ўніверсітэт, дзейнасць філаматаў і філарэтаў (Тадэвуш Лада-Заблоцкі, Франц Савіч).<br>4. Беларуска-польскае культурнае памежжа і яго адлюстраванне ў мастацкай літаратуры. А. Міцкевіч і Беларусь. Творчасць Я. Чачота і Я. Баршчэўскага.<br>5. Травесційныя паэмы «Энеіда навыварат» і «Тарас на Парнасе»: праблема аўтарства, мастацка-вобразная сістэма твораў.<br>6. Творчасць В. Дуніна-Марцінкевіча: асноўныя жанры, ідэйны змест твораў, іх стылёвыя адметнасці.<br>7. Месца і роля Ф. Багушэвіча ў беларускай літаратуры. Тэма свабоды ў вершаваным апавяданні «Кепска будзе».<br>8. Літаратурная кагорта пісьменнікаў-дэмакратаў: А. Абуховіч, А. Гурыновіч.<br>9. Даследаванне псіхалогіі простага чалавека ў паэме Янкі Лучыны «Паляўнічыя акварэлькі з Палесся». Тэма экалогіі ў творы. | 1 | 1 | Тэст |
| **7.** | **ЛІТАРАТУРА ПЕРШАЙ ПАЛОВЫ ХХ СТ.** | **1** | **1** | Залік |
| | 1. Грамадскія ўмовы і агульная характарыстыка беларускай літаратуры пачатку ХХ стагоддзя. Нашаніўскі перыяд. Станаўленне беларускай паэзіі, прозы, драматургіі, літаратурнай крытыкі і публіцыстыкі. | 1 | 1 | Тэст |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| | 2. Літаратурныя партрэты вядомых нашаніўцаў: Цёткі, Ядвігіна Ш., Змітрака Бядулі, А. Гаруна, М. Гарэцкага і інш.<br>3. Адлюстраванне нацыянальнай ідэі ў паэтычнай і драматургічнай творчасці Янкі Купалы.<br>4. Паэзія і проза Якуба Коласа як этапы зацвярджэння класічнасці новай беларускай літаратуры.<br>5. Традыцыі і наватарства, жанрава-стылістычныя асаблівасці творчасці Максіма Багдановіча.<br>6. Беларуская літаратура перыяду нацыянальнага будаўніцтва (1920–1930 гг.). Літаратурныя аб'яднанні «Маладняк», «Узвышша», БелАПП і інш. Развіццё паэзіі, прозы, крытыкі і літаратуразнаўства.<br>7. Станаўленне і развіццё беларускага рамана і аповесці: Пафас і тэматычны абсяг. Жанрава-стылістычныя асаблівасці.<br>8. Раман А. Мрыя «Запіскі Самсона Самасуя» ў кантэксце беларускай і еўрапейскай сатырычнай прозы. Параўнальная характарыстыка Самсона Самасуя з героямі Я. Гашака, М. Булгакава, К. Крапівы.<br>9. Сацыяльныя і псіхалагічныя праблемы калектывізацыі ў творчасці М. Зарэцкага. Асноўная праблема рамана М. Зарэцкага «Вязьмо». Адносіны аўтара да калектывізацыі. Роля вобраза Галілея ў прадбачанні аўтарам будучыні. Праблема гуманізму. «Пацяробаўшчына» як агульная з'ява калектывізацыі. Паняцце тэмы і праблемы літаратурнага твора.<br>10. Сацыялістычны рэалізм: станаўленне канону і сучасная дэкананізацыя.<br>11. Літаратура перыяду Вялікай Айчыннай вайны і першых пасляваенных дзесяцігоддзяў.<br>12. Архетыпы і сімволіка ў раманах К.Чорнага «Пошукі будучыні» і «Млечны шлях». Аўтарскі аналіз сістэмы духоўных каштоўнасцей беларусаў. | | | |
| **8.** | **ЛІТАРАТУРА ДРУГОЙ ПАЛОВЫ XX СТ.** | **1** | **1** | Залік |
| | 1. Паэзія: агульныя тэндэнцыі і творчыя індывідуальнасці, жанрава-тэматычны дыяпазон (А. Куляшоў, М. Танк, П. Панчанка, Н. Гілевіч, Р. Барадулін). Традыцыі і наватарства, творчыя эксперыменты. Творчыя засваенні сусветнага вопыту і ўласныя набыткі ў галіне паэтычных жанраў: санеты, актавы, рубаі, хоку, вершаказы, пункціры. Інтэлектуалізацыя мастацкага мыслення. Філасофская і рэлігійна-хрысціянаская заглыбленасць<br>2. Проза: жанрава-стылістычная і тэматычная разнастайнасць беларускага рамана, малыя празаічныя жанры (В. Быкаў, У. Караткевіч, Я. Сіпакоў, В. Карамазаў). Паказ сацыяльных і маральных канфліктаў, выклікаў часу; асэнсаванне гістарычнага мінулага. Псіхалагічная завостранасць і філасофская паглыбленасць твораў. Узбагачэнне новымі тэмамі. Развіццё гістарычнай тэматыкі. Паняцце экзістэнцыялізму. Экзістэнцыялізм у беларускай літаратуры. | 1 | 1 | Франтальнае апытанне па кантрольных пытаннях |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| | Паказ сацыяльных і маральных канфліктаў праз пастаноўку пытанняў экалогіі ў эпічных творах.<br>3. Драматургія: традыцыі і наватарства, зместавая сутнасць канфліктаў часу (асабістых і грамадскіх). Шляхі абнаўлення традыцыйнай паэтыкі: псіхалагізм, сімвалізм, парадаксальнасць, эксперымент, ірацыянальны пачатак постмадэрнісцкая гульня. Творчасць А. Макаёнка («Трыбунал», «Зацюканы апостал»), К. Крапівы («Хто смяецца апошнім»). Гістарычная тэма і яе ўвасабленне ў творчасці А. Дударава («Князь Вітаўт», «Палачанка»). Драматургічныя творы А. Петрашкевіча («Напісанае застаецца»).<br>4. Сучасны стан літаратурнага працэсу. Развіццё паэзіі (Л. Дранько-Майсюк, Алесь Бадак і інш.), прозы (А. Федарэнка, Л. Рублеўская, В. Марціновіч і інш.), драматургіі (У. Сауліч, І. Сідарук, Ю. Станкевіч, С. Кавалёў, А. Курэйчык і інш.), літаратурнай крытыкі. Беларускія тэатры і іх рэпертуар сёння. | | | Тэст |
| | **УСЯГО** | **8** | **4** | |

## Інфармацыйна-метадычная частка
## Рэкамендаваная літаратура

### Асноўная

1. ЭВМК па дысцыпліне «Беларуская літаратура» [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://dist.belstu.by/course/view.php?id=2887. Дата доступу: 25.12.2023.

2. Трус, М. В. Беларуская паэзія XVI–XX стст. Хрэстаматыя : дапаможнік для студэнтаў спецыяльнасці 1-47 01 01 «Выдавецкая справа» / М. В. Трус. – Мінск : БДТУ, 2015. – 275 с.

3. Трус, М. В. Гісторыя беларускай літаратуры: практыкум : вуч.-метад. дапаможнік для студэнтаў спецыяльнасці 1-47 01 01 «Выдавецкая справа» / М. В. Трус. – Мінск : БДТУ, 2015. – 322 с.

4. Трус, М. В. Максім Багдановіч: коды жыцця і творчасці : манаграфія / М. В. Трус – Мінск : БДТУ, 2015. – 179 с.

### Дадатковая

5. Багдановіч, І. Э. Авангард і традыцыя: беларуская паэзія на хвалі нацыянальнага адраджэння / І. Э. Багдановіч. – Мінск : Беларуская навука, 2001. – 386 с.

6. Бельскі, А. І. Краса і смутак: дапаможнік для настаўнікаў / А. І. Бельскі. – Мінск : Мастацкая літаратура, 2000. – 236 с.

7. Верабей, А. Уладзімір Караткевіч: жыццё і творчасць / А. Верабей. – 2-е выд., дапрацаванае і выпраўленае. – Мінск : Беларуская навука, 2005. – 269 с.

8. Гарадніцкі, Я. А. Літаратура як мастацтва: камунікатыўнасць, інтэрмедыяльнасць, наратыўнасць / Я. А. Гарадніцкі. – Мінск : Беларуская навука, 2016. – 400 с.

9. Гарадніцкі, Я. А. Думка і вобраз: Праблема інтэлектуалізму ў сучаснай беларускай лірыцы / Я. А. Гарадніцкі. – Мінск : Навука і тэхніка, 1986. – 120 с.

10. Гісторыя беларускай літаратуры XI – XIX стагоддзяў: у 2-х т. / Т. 1: Даўняя літаратура: XI – першая палова XVIII стагоддзя / НАН Беларусі, І-нт літ. імя Я. Купалы; навук. рэд. В. А. Чамярыцкі. – Мінск, 2006; Т. 2: Новая літаратура: другая палова XVIII – XIX стагоддзя / НАН Беларусі, І-нт літ. імя Я. Купалы; навук. рэд. У. І. Мархель, В. А. Чамярыцкі. – Мінск, 2007.

11. Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддзя: у 4-х т. / рэдкал.: У. В. Гніламёдаў [і інш.]. – Мінск : Беларуская навука, 1999–2003. – Т. 1–4.

12. Гісторыя беларускай літаратуры. Старажытны перыяд: падручнік для студ. філалаг. спец. вышэйш. навуч. установ / М. М. Грынчык, У. А. Калеснік, У. Г. Кароткі і інш.; Пад агульн. рэд. М. А. Лазарука, А. А. Семяновіча. – 3-е выд., стэр. – Мінск : Вышэйшая школа, 1997. – 389 с.

13. Гісторыя беларускай літаратуры. Дакастрычніцкі перыяд: у 2-х т. / пад рэд. А. Лойкі. – Мінск, 1989. – Т. 1–2.

14. Гісторыя беларускай літаратуры, XIX – пачатак XX ст. : падруч. для філал. спец. выш. пед. навуч. установ / І. Э.Багдановіч, У. В.Гніламёдаў,

Л. С.Голубева [і інш.] ; пад агул. рэд. М. А.Лазарука, А. А.Семяновіча. – Мінск : Вышэйшая школа, 1998. – 559 с.

15. Гісторыя беларускай літаратуры: ХХ ст. (20−50-я гады ХХ стагоддзя): падручнік / У. В. Гніламёдаў [і інш.] ; пад агул. рэд. М. А. Лазарука, А. А. Семяновіча. − 2-е выд., дапрац. і дап. − Мінск : Вышэйшая школа, 2000. − 385 с.

16. Гісторыя беларускай савецкай літаратуры. 1941–1980 : падручнік / пад рэд. М. А. Лазарука, А. А. Семяновіча. – Мінск : Вышэйшая школа, 1983. – 479 с.

17. Дасаева, Т. М. Беларуская літаратура ХХ – пачатку ХХІ стагоддзя: вучэбны дапаможнік / Т. М. Дасаева. – Мінск : РІВШ, 2016. – 264 с.

18. Драздова, З. У. Творчасць А. Мрыя і Л. Калюгі: стылявыя асаблівасці / З. У. Драздова. – Мінск : Беларуская навука, 1997. – 141, [2] с.

19. Лойка, А. А. Старабеларуская літаратура : падруч. для студ. ВНУ / А. А. Лойка. – Мінск : Вышэйшая школа, 2001. – 319 с.

20. Мішчанчук, М. І. Беларуская літаратура ХХ ст.: вучэбны дапаможнік для філалагічных спецыяльнасцей вышэйшых навучальных устаноў / М. І. Мішчанчук, І. С. Шпакоўскі. – Мінск : Вышэйшая школа, 2001. –351, [1] с.

21. Мішчанчук, М. І. Літаратура беларускага замежжа: вуч. дапам. / М. І. Мішчанчук. – Мінск : БДПУ імя Максіма Танка, 1999.

22. Саверчанка, І. Старажытная паэзія Беларусі XVI – першай паловы XVII стагоддзя / І. Саверчанка. – Мінск : Навука і тэхніка, 1992. – 254 с.

23. Семяновіч, А. А. Гісторыя беларускай савецкай драматургіі, 1917–1955 гады: вучэбны дапаможнік для педагагічных інстытутаў па спецыяльнасці 02.19 «Беларуская мова і літаратура» / А. А. Семяновіч. – Мінск : Вышэйшая школа, 1990. – 292, [2] с.

24. Федарцова, Т. М. Асаблівасці літаратуры XIX стагоддзя: дапам. для студэнтаў спецыяльнасці «Выдавецкая справа» і «Філалогія» / Т. М. Федарцова. − Мінск, 1999.

25. Чамярыцкі, В. Беларускія летапісы як помнікі літаратуры / В. Чамярыцкі. – Мінск : Навука і тэхніка, 1969. – 192 с.

26. Чыгрын, І. П. Проза «Маладняка» : дарогамі сцвярджэння / І. П. Чыгрын ; [рэд. І. Я. Навуменка] ; Акад. навук БССР, Ін-т літ. імя Я. Купалы. – Мінск : Навука і тэхніка, 1985. – 144 с.

27. Чыгрын, І. П. Крокі: проза «Узвышша» / І. П. Чыгрын. – Мінск : Навука і тэхніка, 1989. – 142, [2] с.

## Пералік рэкамендаваных сродкаў дыягностыкі кампетэнцый студэнтаў

Для атэстацыі навучэнцаў на адпаведнасць іх персанальных дасягненняў паэтапным ці канчатковым патрабаванням адукацыйнай праграмы рэкамендавана выкарыстоўваць вусныя і пісьмовыя формы кантролю ведаў (франтальнае апытанне па кантрольных пытаннях, тэсты, праверачныя работы з

заданнямі рознага ўзроўню складанасці).

Міжсесійная атэстацыя па вучэбнай дысцыпліне «Беларуская літаратура» выстаўляецца з улікам вынікаў кантрольных пытанняў, праверачных тэстаў, выступленняў з рэфератамі і паведамленнямі і бягучай паспяховасці. Вынікі міжсесійнай атэстацыі ўлічваюцца пры правядзенні заліку.

## Метадычныя рэкамендацыі па арганізацыі самастойнай работы студэнтаў

Самастойная праца па дысцыпліне «Беларуская літаратура» забяспечвае трывалую прафесійную матывацыю студэнтаў, спрыяе развіццю навыкаў выкарыстання даведачна-інфармацыйнага матэрыялу для вырашэння прафесійных, сацыяльна і асобасна значных задач. Яна прадугледжвае прачытанне і аналіз мастацкіх твораў, вызначэнне іх стыляў і жанраў, канспектаванне навуковай і навукова-папулярнай літаратуры па зададзеных тэмах, падрыхтоўку рэфератаў, выкананне практычных заданняў, тэстаў, а таксама заданняў даследчага і творчага характару.